тыпавы напеў. Па даследаваннях Г. Таўлай, гукавы сімвал Купалля прадстаўлены на Беларусі рэгіянальна адметнымі варыянтамі сямі асноўных тыпавых напеваў [3, с. 25]. У адной вёсцы Купалле можа «гучаць» на тры-пяць мелодый – тыпавых напеваў, – і яны прадстаўляюць своеасаблівы гукавы пашпарт свята, праходзячы скразнымі промнямі праз усе яго абрадавыя цырымоніі (такім чынам «апяваючы» усе акцыянальныя коды свята). За адной мелодыяй (тыпавым напевам) замацавана некалькі песенных тэкстаў, розных па функцыянальным змесце, але агульных па мэтавым абрадавым прызначэнні. Этнафанічная палітра Купалля на Беларусі досыць разнастайная, і яе праявы залежаць ад функцыі і кантэкста спеваў. Адзін з галоўных крытэрыяў выканальніцтва – гэта гучныя «галасныя» спевы ў акустыцы прыроднага асяроддзя, – якія яскрава дэманструюць экстравертную энэргетыку этнафоніі ўсяго вяснова-летняга перыяду.

На аснове дадзенай абрадавай карты і яе этнафанічнага каментара – «Купальскага спеўніка» – абрадавае свята магчыма адаптаваць пад рэгіянальнае (міжрэгіянальнае), ці агульнанацыянальнае Купалле – шляхам вылучэння асобных абрадавых этапаў і падбору да іх песенных узораў (адпаведна мэце правядзення свята). Паводле гэтых матэрыялаў студэнтамі спецыялізацыі «Этнафоназнаўства» ужо былі прадстаўлены шматлікія купальскія этнафанічныя праекты (дыпломны праект «Купалле на Віцебскім Падзвінні» (2008), «Купальская містэрыя» на фестывалях «Берагіня» (2008, 2010, 2012), «Сонцаварот» (2013). Праведзеныя святы яшчэ раз сведчаць пра жывучасць традыцый і жаданне грамадства святкаваць і спяваць разам.

**Спіс літаратуры:**


1. Купалле на «Берагіні» // Берагіня: Пяты Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва (2006 – 2008) / укл. М.А. Козенка. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2008. – С. 250 – 270.
2. Купальскі спеўнік: метадычны дапаможнік // аўтар-укл. Т.А.Пладунова. – Мінск: Інстытут культуры Беларусі, 2013. – 160 с. : іл.
3. Тавлай, Г. В. Белорусское купалье: Обряд, песня / Г. В. Тавлай. – Мінск : Наука і техніка, 1986. – 174 с.: іл.
4. Толстой, Н. И. К реконструкции древнеславянской духовной культуры (лингво- и этнографический аспект) / Н. И. Толстой, С. М. Толстая // Славянское языкознание / VIII Междунар. съезд славистов, Загреб-Любляна, сент. 1978 г. – М. : Наука, 1978. – 469 с., ил. карт.
5. Якімовіч, В. «А йшла Купалка сялом, сялом». Князь-Купаліш і Купалінка / В. Якімовіч // Роднае слова. – 1998 г. – № 6. – С. 175 – 181.



***Сяргей Высkварка***


## ЖНІЎНЫЯ ПЕСНІ ЛЮБАНШЧЫНЫ

*(па матэрыялах фальклорных экспедыцый 1990-2014 гадоў)*

На вялікі жаль, сёння жніўныя песні пры жніве ўжо не пачуць, бо жнівоператварылася ў механічны працэс. Засталіся гэтыя песні толькі ў памяці ўжо састарэлых жней. Ды і пералік іх стаў даволі невялікім, але ад гэтага не менш каштоўны. Песні суправаджалі ўсе абрады, таму на кожным этапе жніва свае песні. Але вядома на Любаншчыне з'ява ўніверсалізацыі абрадавых жніўных песень, калі ў зажынкавых і дажынкавых песнях змяняліся толькі словы «зажынкі» на «дажынкі», і адна і тая ж песня гучала і ў пачатку, і ў канцы жніва. Магчыма, гэта звязана з уяўленнем аб кругавароце жыцця, калі ўсё развіваецца нібы калечкам: дзень-ноч, дзень–ноч... Як прыклад песня, запісаная ў в. Обчын ад аўтэнтычнага гурта «Паваляні»: «Слаўся гаспадарку, слаўся // Што малажаек не стыжаўся // Як яны не стыжаліся // Ніўку тваю зажыналі».

У другім варыянце апошні радок гучыць: «Ніўку тваю дажыналі». Такія пераўтварэнні адбываліся і з іншымі песнямі: «Сёння ў полі да дажынкі ў майго брата да радзіначкі» в. Дарасіно, «А я жала не ляжала» − в. М. Гарадзяцічы.

Песень пары пакрывання поля і на ўсёй Беларусі вядома мала, а на Любаншчыне знойдзеш усяго дзве. «Пашлі Божа многа збожжа // Нарадзі хлеба пры дарозе // І штоб была ўсім гожа // І не пуста ў каждым возе // Крыта, крыта поўна жыта. // Божа памажы хлеба ўрадзіць, // Божа памажы хлеба ўрадзіць» (в. Обчын). Тлумачыць сэнс гэтай песні мабыць будзе залішне. А вось у другой песні пяецца пра «красу», якая асімілюецца ў плоднасць нівы, бо вядома, што абрад пакрывання поля здзяйсняла маладая замужняя жанчына ў перыяд дзетароднасці. «Ой, у полі, ой, у полі паляначка // ...паляначка. Там гуляла паненачка // ...паненачка. Рассеяла сваю красу // ...красу. Расці, расці, мая краса // ...краса. Ні вяліка ні малая // ...ні малая. Як самая маладая» (в. Баянічы).

Выпраўляючыся на зажынкі, песень не спявалі. Прыйшоўшы на поле, віталіся з нівою, пачыналі жаць, пасля таго, як «паложаць на хрэст» спявалі: «Я ў полі жыта жала», «Ой у полі зажыначкі», «А я жала не нажала», «Ой пайду жыта парубаю»...

Адыходзячы з поля з зажынкавым снапом, спявалі аб тым, што з наступнага дня з раніцы будзе жніво аж да вечара: «Гаварыла поле шырокае, жыта ядраное: // Жнейкі, жнейкі мае маладыя, сярпы залатыя // Прыдзіце ка мне заўтра рана, каб я не стаяла // Не хачу я ў полі стаяці, каласамі махаці // А толькі хачу ў полі-снапамі, у гумне-капамі» (в.Пласток).

Калі падыходзілі да дому запявалі: «Галубок снапок // Нажалі малажайкі // Да ў іх белые ручкі // Месец месечку // Свяці нам дарожачку // Штоб мы не зблудзілі // Снапочка не згубілі // Бо нам снапок красны //

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як месячак ясны // Бо нам снапок вышэй плота // Ён з чыстага злота» (в.Обчын). Перадаючы сноп гаспадару, спявалі «Слаўся, слаўся гаспадарку», прычым аднолькавы момант з гэтай песняй быў і на дажынках.

На наступны дзень, пасля зажынак, жыта пачыналі жаць ад раніцы да вечара, і вядома ж, цэлы дзень не змаўкалі песні над нівай. Дзе, як не ў песні магла выказаць усе свае думы, памкненні, абразы і пажаданні жанчына. Гэтыя ж песні былі павучальнымі перасцярогамі для маладзейшых. Гісторыямі аб жыцці-быцці, і калыханкамі для маленькіх дзетак − «жытнічкаў». Асабліва ўпадабаным жанрам жніўных песень былі балады: «А я ў полі жыта жала», «Ночка цёмна да нявідна», «Ой пайду я кругом луга», «Чырвоная каліначка», «Нарадзіла мяне маці ў полі жыта жаці», «Да ўжо сонца закоціцца». Як прыгожа гучаў голас жней над нівай, і як замірала сэрца пачуўшы словы балады: «...Ой я ждала да не даждала, мусіць не даждуся // ...мусіць не даждуся. Ой паслала б чорну галку мусіць не дашлёся // ... мусіць не дашлюся. Ляці ляці чорна галка на Дунай рыбку есці // ...на Дунай рыбку есці. Дай прынясі чорна галка ад мілога звесці... » (в.Таль. Валянціна Грышкевіч 1935 г.нар.).

У час жніва самым нежаданым з’яўляўся дождждык, таму пры першых воблачках на небе запявалі жнеі песню: «Перанясі Божа хмару на чужую сторану // Не ідзі туда хмара, дзе жанцы жыта жнуць // Да ідзі туда хмара, дзе цябе ўсе ждуць // Не ідзі туда хмара дзе касцы косяць, // Да ідзі туда хмара, дзе цябе просяць» (в. Камуна).

Цяжкая праца на працягу дня адбірала ўсе сілы. Вось бліжэй да вечара і гучалі песні-просьбы: «Ой сонейка , ты сонейка // ...ты сонейка. Закаціся ты скоранька //...скоранька. Як сонейка, як сонейка закоціцца // ...закоціцца. Мне дадому захочацца // ...захочацца. Ужэ сонца, ужэ сонца далоў // ... далоў. Ужэ жнеечкі дамоў, дамоў» (в. Баянічы. Надзея Кандраценя 1912 г. нар.).

Існавала такое павер’е: «Кажуць, як не дажнеш да абеду снапа, дак і абедаць не будзеш, будзеш есці сноп. Тыя дажнуць, а тыя ўжо зносяць у бабкі ўжэ снапы. І вот ужэ там селі, ужэ сядзяць і ядзяць. І вот ужэ тая, што носіць снапы, пяе: «Ой ўсе людзі палуднуюць // А нашые не думаюць // Да шкадуюць часу сесці // Скарыначку хлеба з’есці // Ды вадзіцы папіваці // Пад снапочкамі паляжаці» (в. М. Гарадзяцічы Марыя Слівец 1925 г. нар.).

Магчыма, гэта асаблівасць Любаншчыны, а, магчыма, у іншых рэгіёнах даследчыкі не звярталі на гэта ўвагі, але жалі тут не кожны дзень. Не жалі на Палікапа, на Макавея і ў нядзелю − грэх. У гэтыя дні хадзілі да царквы, або ў ягады. Канечне ж, і там не абыходзілася без песні. Часцяком пачыналіся гэтыя песні са слоў: «Ой, пайду я жыта жаці, а яшчэ жыта зялёнае». Далей апавядалася аб тым, як люба маці, і не люба свякруха. Вядома некалькі варыянтаў гэтай песні.

Заключны этап жніва – «Дажынкі», пагэтаму і песні заканчэння жніва маюць назву – дажынкавыя. На Любаншчыне яны даволі разнастайныя. Умоўна іх можна падзяліць на чатыры групы. Першая – песні аб гаспадары, які падганяе сваіх жнеек і абяцае пачастунак. Нярэдка гэтыя песні маюць жартаўлівы характар: «Ой, наш пан баран, баран // Не пускае дамоў зарань // Наша пані авечая // Дзержыць жнеек да вечара // Кінь ма сярпы додолу // Самі хадзм да дому» (пан – у сэнсе гаспадар) (в. Обчын. Зоня Галай 1930 г. нар.). Другая – песні аб дажынках-радзінках. Усе яны пачынаюцца са страфы: «Ой, да ў полі дажыначкі //А ў хаце радзіначкі... ». Магчыма, тут пяецца аб нараджэнні новага хлеба. Змест жа гэтых песень аб цяжкім жніве і вясёлым яго завяршэнні. Вось, як аб гэтым спявалі ў вёсцы Закальное: «...Да як дажнёмся мы да дуба // То палуднаваць мы там будам // Як дажнёмся мы да мяжы // То ў нас там поўныя кадзяжы // І закускі і віна // Да чаго ж наша душа паўна... ». Трэцяя – песні аб заканчэнні жніва, аб яго фінале: «Як на нашай ніўцы сягодня дажынкі // Дзіва, дзіва. // Відзіць мае вочкі краёк недалечка // Дзіва, дзіва // Да краёў дажнёмся мёду мы нап’ёмся // Дзіва, дзіва» (в. Обчын).

Аб тэматыцы наступных песень могуць сказаць ужо толькі першыя строфы: «У нас сягодня вайна была» в. Н. Юрковічы, «Да ўжо пара дамоў, дамоў» в. Забалаць, «Ой, ужо ў полі дажыначкі» в. Дарасіно...

Чацвёртая – песні аб сэнсе дажыначных рытуалаў: «Выпраўляюцца малажайкі // На спраўленне дажынак // Паглядзець на дабро гаспадаркі // І прынесці жыта поўны набірак // Дык гатоў жа, гатоў, гаспадыня, // Сустрачэнне ім шчырае, // Расчыняй калі ёсць скрыня // І бяры, нясі мёд з вырая» (в. Обчын).

Як пашану гаспадару прыпадносілі «вянок і бараду – гэта як дажыналі, то бараду астаўлялі». «Дажалі ў ражок сышлі // Пад мяжою вянок нашлі // Просім пана вянок зняці // Нам за вянок выпіць даці».

Ужыванне гарэлкі мае ахвяравальнае значэнне, як сыр, хлеб, соль, пагэтаму так часта аб ёй і спяваюць. Напэўна сыр, хлеб, соль – ахвяра духам поля, а гарэлка − людзям за працу.

Вядомы на ўсёй Беларусі абрад заканчэння жніва талакою меў распаўсюджанне і на Любаншчыне. Сам абрад амаль нічым не адрозніваецца, а вось песні называюцца не талочныя, як у спецыяльнай літаратуры, а талачыннымі. Спявалі ў час зборнай талакі. Адны з іх мелі шлюбна накіраваны характар, гаварылі аб тым, што на талацэ, як і ва ўсялякай гуртавой справе можна нагледзець жаніха: «І вой, пайду я на талаку // На толацэ дай усе талоццы // На толацэ дай усе талоццы // Ены з мяне ўсе смяюцца // Што я ў тоўстай дэй сароццэ // Што я ў тоўстай дэй сароццэ // Ой я ў тойстуй падзірануй // На хлопчыка дэй пазіраю» (в. М.Гарадзячыцы). У іншых песнях спявалі аб працавітасці і здольнасці да цяжкай працы: «Вой я жала да і не ляжала // Вой я жала на шчыруй праўдзе» (в. Палічын).

Існуюць песні, у якіх дзяўчына просіцца ў маці адпусціць яе на гулянне, фактычна на талаку, якая затым завяршаецца пагулянкай: «Да ленуся гэта жыта жаці // Пусці, маці, канапель браці // Пусці, маці, канапель браці // Канапелькі зеляненькі // Пусці, маці, дай пагуляці» (в. М.Гарадзячыцы).

Самая вялікая група талочных песень Любаншчыны прысвечана тэме сямейна-родавых адносін: «Многа роду, многа роду, ды не к каму прыхіліцца» або «Ой, у бору абед вару, з-пад карэння вады бяру». Але

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

найшырэй гэту тэму раскрывае песня, запісаная ў вёсцы Малыя Гарадзяцічы ад Марыі Слівец 1925 года нараджэння.

«Горкі палын, горкі палын // Горкі яго ўсё й карэньечко // Горкі яго ўсё й карэньечко // Да не люблю я свайго мужа // Страшнэ яго пакаленьечко // Страшнэ яго пакаленьечко // Да ён мяне б'е, карае, // Што я к яму дай не хілюся // Што я к яму дай не хілюся // Да прыхілюся я к бярэзцэ // Мне бярозка дай не мамачка // Вецер вее голье ломіць // Са мной бярозка дай не гаворыць // Прыхілюся я к дубочку // Мне дубочак дай не татачка // Вецер вее голье ломіць // Са мной дубочак дай не гаворыць // Прыхілюся я к вольхаццэ // А мне вольхачка дай не сястрыца // Вецер вее голье ломіць // Са мной вольхачка дай не гаворыць // Прыхілюся я к яварочку // Мне яварок дай не брацейка // Вецер вее голье ломіць // Са мной явар дай не гаворыць». У песні глыбінны сэнс, які перадае нават роднасныя пачуцці. Самы дарагі чалавек маці, а затым бацька, сястра , брат, а павінна жыць з мужам, хай сабе ён і «б'е , карае».

Такім ладам ішло жыццё на працягу многіх стагоддзяў, але прыйшла на Беларусь чырвоная навала і прынесла свае змены. Яны ж не маглі не адбіцца на песнях народа. Вось і з'явіліся новыя жніўныя песні. Фактычна яны былі відазмененыя аналагі старых: мяняўся тэкст, а мелодыя заставалася ранейшай: «Ай, добры дзень, калгаснае поле, // Жыта ядраное. Ай, добры дзень! // Ай, добры дзень, жнейкі маладыя. // Сярпы залатыя. Ай, добры дзень! // Прыхадзіце брыгадаю раненька, // Як узыдзе сонейка. Прыхадзіце! // Вы зажніце шырокае поле, // Жыта залатое. Вы зажніце!» (в.Калінаўка).

Не мог у новым часе не гучаць у песнях палітычны падтэкст, які павінен быў праслаўляць новы лад, а прыжываліся новыя песні, дзякуючы шчырай веры людзей у праўду новага ладу.

«А жнуць жнейкі, дажынаюць // І вяночкі завіваюць // Не для пана багатага // Для калгаса вялікіга». Магчыма, дзякуючы пераўвасабленням гістарычных пластоў традыцыйнай народнай культуры, яна і дажыла ў памяці носьбітаў да нашых дзён. Яе, як найвялікшую каштоўнасць, трэба зберагаць і перадаваць у спадчыну нашчадкам. Жніўныя песні − адзін з дыяментаў гэтай культуры і заслугоўваюць вялікай увагі і пашаны.

***Ларыса Рыжкова***

## «АБЫДЗЁННІК»: НАТАТКІ ПЕДАГОГА ПА БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ СПЕВАХ

Сучасныя людзі часцей жывуць у горадзе. Гавораць сцішана, рухаюцца не размашыста. Многія фізіічныя якасці чалавека знікаюць, як непатрэбныя яму. Сярод іх голас. Голасам чалавек можа спяваць, пасылаць інфармацыю, радавацца жыццю і яго працягу…

Народная практыка «пастаноўкі голаса» не была спецыяльным заняткам, а была часцінай жыцця. Разгледзім жыццёвыя сітуацыі «пастаноўкі голаса» для народных спеваў.

…У ДВАРЫ. Раней дом быў неабходны чалавеку, каб укрыцца ад непагоды, пераначаваць, а астатнія справы зручней было зрабіць, найперш, у двары. Тут быў хлеў, калодзеж, агарод, сад, майстэрні, баня, склепы, амбары і многае іншае. Тут чалавек быў гаспадаром і, не маючы суседа за сцяною- плотам, мог гаварыць громка, крычаць, клікаць. Гэты покліч мог быць накіраваны ў хату, на агарод, далёка ў поле, суседу ў другі двор, скаціне ў хлеў, курам, сабаке. Ужо з парога пачыналася пастаноўка голаса, фарміраваўся правільны пасыл гука і правільнае для таго дыханне.

…У ЛЕСЕ. У лесе спрадвечна людзі праводзілі многа часу за зборам грыбоў і ягад. У лесе маглі пасвіць мелкі статак (коз, авечак), рыхтавалі дровы, касілі траву на палянах. А каб не сумаваць, ці не згубіцца, ці не падпусціць блізка ваўка, мядзведзя, спявалі, перагукваліся.

Лес – добрая сітуацыя для пастаноўкі голаса. У лесе ўзнікае правільны пасыл гука і неабходная мера гука. У лесе ёсць пэўная акусціка. Гук пасылаецца, як праз рэшата з дрэў. Дрэвы нібы ўзносяць і разносяць гук. Лес дае адчуванне кучнасці спевакам, трымае іх на дасягальнай для ансамблевых спеваў адлегласці. Хто слаба чуе галасы, разумее, што далёка адышоў.

Спевы ў лесе прывучаюць слухаць - улічваць галасы другіх спевакоў. Строіць з імі музычную гармонію нават на адлегласці. Занятасць работай, нязручная поза, вызваляюць гук, дапамагаюць забыцца на яго, а, значыць, спяваць без зажымаў і фізічных напружанняў у голасе і дыханні.

…У ПОЛІ. У полі спявалі жнейкі, дзеці пад час гульняў, касцы і грабцы на касавіцы, талочнікі. У полі спяваць складана, таму што прастора наўкола і неба над галавой робяць чалавека кропелькай. А яшчэ бывае ветрана, неспакойна ў прыродзе. А яшчэ цяжкая праца жняі, калі выпадае спяваць, сагнуўшысь да зямлі.

Дапамагаў правільна знойдзены тон песні, максімальная рытмічная знітаванасць спеваў з працай, калі адно другому дапамагала, адно другое выклікала. Спевы, праца, дыханне, рухі калектыва жнеек былі знітаваны, як дзеянне аднаго гарманічнага арганізма.

Спевы ў полі дапамагалі знайсці адзінамагчымы спосаб пасылу гука, які пераадолее прастору і не змучае самаго спевака, не сарве голас, будзе і самаму спеваку ў асалоду.

…У ВЁСЦЫ. Многа жанраў у фальклоры існавала для спеваў на вясковай вуліцы. Гэта калядныя, вясельныя, вялікодныя, траецкія, зажынкавыя і дажынкавыя песні. Спявалі, ідучы па дарозе ці стоячы ў двары, пад вокнамі, на скрыжаванні дарог, у цэнтры вёскі. Такія спевы звязаны з рухам няспешным і з прытанцоўкай.

Гэта прамова, аб'ява, віншаванне, адрасаванае аднавяскоўцам, суседзям, гасцям. Такія спевы – аб'явы вучаць добра вымаўляць тэкст, непазбежна фарміруюць ідэальную артыкуляцыю, якой заўсёды здзіўлялі